# Аб палітычных дакладах сярод насельніцтва

Т. КІСЯЛЁЎ, С. ГІЛІЛАЎ

Совецкі Саюз паспяхова ажыццяўляе пераход ад соцыялізма да комунізма. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі совецкія людзі сваёй самаадданай працай забяспечылі датэрміновае выкананне пасляваеннай сталінскай пяцігодкі, у кароткі тэрмін аднавілі разбураную фашысцкімі захопнікамі народную гаспадарку і ў значных размерах перавысілі даваенны ўзровень яе развіцця. Прамысловая вытворчасць у нашай краіне к пачатку 1952 года падвоілася ў параўнанні з даваенным 1940 годам. Велізарныя дасягненні мае наша краіна ў развіцці сельскай гаспадаркі, навукі, культуры. У гады пасляваеннай пяцігодкі нарадзіліся і ўсталяваліся новыя формы соцыялістычнага спаборніцтва, якія забяспечваюць высокія якасныя паказчыкі ў рабоце прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Совецкі народ разгарнуў велізарную стваральную дзейнасць у барацьбе за перамогу комунізма. Штогод вырабляюцца сотні новых відаў станкоў і механізмаў, якія забяспечваюць велізарны рост прадукцыйнасці працы, аблягчаюць працу совецкіх людзей. Разгорнута гіганцкая работа па збудаванню найвялікшых у свеце гідраэлектрастанцый і арашальных сістэм. Ажыццяўляецца сталінскі план пераўтварэння прыроды. Совецкія вучоныя паспяхова вырашаюць задачу, пастаўленую таварышам Сталіным аб развіцці совецкай навукі.

Натхніцелем і арганізатарам сусветна-гістарычных перамог совецкага народа, кіраўніком барацьбы за перамогу комунізма выступае вялікая партыя Леніна — Сталіна. Большэвіцкая партыя выхавала совецкіх людзей у духу беззаветнай адданасці справе комунізма, велізарнай любві да сваёй соцыялістычнай Радзімы, лютай нянавісці да яе ворагаў. Шырока ўцягваючы народныя масы ў будаўніцтва комунізма, партыя большэвікоў выхоўвае масавы гераізм у працы і ўзнімае ўзровень свядомасці мільёнаў працоўных нашай краіны. Партыя Леніна — Сталіна развіла рухаючыя сілы совецкага грамадства — совецкі патрыятызм, дружбу народаў, маральна-палітычнае адзінства.

Аднак неабходна мець на ўвазе, што перажыткі капіталізма, перажыткі прыватнаўласніцкай псіхалогіі яшчэ жывуць у свядомасці некаторай, адсталай часткі совецкіх людзей. Перажыткі гэтыя праяўляюцца ў нядбайных адносінах да працы і соцыялістычнай уласнасці, у асобных формах забабонаў, нацыяналізма, касмапалітызма, праклянення перад растленнай буржуазнай культурай і т. п. Кіруючыя класы варожых нам капіталістычных дзяржаў усяляк імкнуцца ажывіць перажыткі капіталізма ў свядомасці совецкіх людзей і такім шляхам спрабуюць аслабіць Совецкую дзяржаву, падарваць маральна-палітычнае адзінства совецкага грамадства.

Большэвіцкая партыя, таварыш Сталін надаюць велізарнае значэнне комуністычнаму выхаванню працоўных як аднаму з рашаючых сродкаў паспяховага пераходу ад соцыялізма да комунізма. Забеспячэнне велізарнага развіцця прадукцыйных сіл, стварэнне багацця матэрыяльных здабыткаў, як важнейшай умовы гэтага пераходу, патрабуе мабілізацыі ўсіх творчых здольнасцей совецкіх людзей, высокага ўсведамлення іх абавязку перад Радзімай.

XVIII з'езд ВКП(б) адзначыў велізарнае значэнне комуністычнага выхавання працоўных для паспяховай пабудовы комуністычнага грамадства. Толькі пры ўмове высокага ўзроўню свядомасці мас магчыма паспяховая пабудова комунізма. В. І. Ленін гаварыў: «... чым глыбей пераўтварэнне, якое мы хочам зрабіць, тым больш трэба ўзняць цікавасць да яго і свядомыя адносіны, пераканаць у гэтай неабходнасці новыя і новыя мільёны і дзесяткі мільёнаў» (Творы, т. 31, стар. 464).

Гэта азначае, што чым больш узрастаюць задачы па будаўніцтву комунізма, тым больш узрастае роля выхаваўчай работы ў масах. «Па нашаму ўяўленню, — гаварыў Ленін, — дзяржава моцная свядомасцю мас. Яна моцная тады, калі масы ўсё ведаюць, аб усім могуць меркаваць і ідуць на ўсё свядома» (Творы, т. 26, стар. 224).

Растлумачэнне шырокім масам рашэнняў партыі і яе заклікаў, пераканание мас у правільнасці палітыкі большэвіцкай партыі робіць палітыку партыі зразумелай і блізкай кожнаму совецкаму чалавеку, мабілізуе працоўных на барацьбу за ажыццяўленне гэтай палітыкі, на вялікія подзвігі ў імя магутнасці нашай радзімы. Усямернае разгортванне масава-палітычнай работы набывае таму ў сучасны момант асабліваe значэнне як важнейшы сродак выхавання мас у духу комунізма і мабілізацыі іх на ажыццяўленне грандыёзных задач, што стаяць перад Совецкай дзяржавай.

Пастановы ЦК ВКП(б) па ідэалагічных пытаннях прывялі да значнага расшырэння размаху і павышэння ідэйнага зместу ўсёй масава-палітычнай работы. Важнай умовай павышэння ідэйнага ўзроўню масава-палітычнай работы з'яўляецца асабісты ўдзел у ёй кіруючых партыйных і совецкіх работнікаў, якія павінны сістэматычна выступаць з палітычнымі дакладамі на масавых сходах рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі. Выступленні кіруючых работнікаў з палітычнымі дакладамі з'яўляюцца магутным сродкам умацавання сувязі партыі з масамі, комуністычнага выхавання працоўных і мабілізацыі іх на паспяховае вырашэнне гаспадарча-палітычных задач.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) патрабуе ад партыйных арганізацый пастаяннай і пільнай увагі да гэтага пытання. У 1943 годзе ЦК ВКП(б) прыняў спецыяльную пастанову «Аб палітычных дакладах кіруючых партыйных і совецкіх работнікаў для сельскага насельніцтва», у якой адзначаецца як нецярпімая з'ява самаўхіленне часткі нашых кадраў ад палітычнай работы сярод насельніцтва. ЦК ВКП(б) прапанаваў праводзіць у кожным калгасе не радзей аднаго разу ў адзін — паўтара месяцы сходы калгаснікаў з дакладамі кіруючых работнікаў. У пастанове «Аб недахопах і мерах палепшання работы з агітатарамі ў Сталінградскай партыйнай арганізацыі», прынятай у 1947 годзе, ЦК ВКП(б) таксама адзначыў, што многія кіруючыя работнікі ўсё яшчэ рэдка выступаюць з дакладамі на сходах рабочых і калгаснікаў, што з'яўляецца чуждым традыцыям большэвіцкай партыі і супярэчыць надзённым інтарэсам соцыялістычнага будаўніцтва. Выконваючы ўказанні Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), ЦК КП(б) Беларусі ў ліпені 1950 года прыняў пастанову аб арганізацыі рэгулярных выступленняў кіруючых кадраў з палітычнымі дакладамі перад насельніцтвам. Мінула два гады з моманту прыняцця гэтай пастановы. За гэты час актыў компартыі (большэвікоў) Беларусі выступаў з палітычнымі дакладамі па 13 розных тэмах, якія зацвярджаліся ЦК КП(б)Б. З палітычнымі дакладамі ў рэспубліцы выступае каля 13 тысяч кіруючых рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх і раённых работнікаў. Палітычнымі дакладамі па кожнай тэме ахопліваецца да двух мільёнаў чалавек. Аддзел прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б па кожнай тэме распрацоўвае ў дапамогу дакладчыкам матэрыял.

Дакладчыкі ў сваіх выступленнях на сходах растлумачваюць працоўным задачы комуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, паказваюць рабочым і калгаснікам непасрэдную сувязь агульных задач з канкрэтнымі задачамі кожнага калгаса, соўгаса, МТС, прадпрыемства, падкрэсліваючы, што ад намаганняў кожнага совецкага чалавека залежыць поспех выканання вытворчых планаў, далейшы рост магутнасці Совецкай дзяржавы і добрабыту народа. У дакладах прыводзіцца багаты матэрыял, які культывіруе совецкі патрыятызм, выхоўвае працоўных у духу любві і адданасці соцыялістычнай радзіме, партыі Леніна — Сталіна. Кіруючыя работнікі, выступаючы перад працоўнымі, расказваюць аб падзеях міжнароднага жыцця, аб мірнай знешняй палітыцы СССР, выкрываюць прошукі амерыкана-англійскіх імперыялістаў, паказваюць поспехі міжнароднага руху прыхільнікаў міру, дасягненні краін народнай дэмакратыі.

Накоплены партыйнымі арганізацыямі рэспублікі вопыт правядзення палітычных дакладаў сярод працоўных паказвае, што асабісты ўдзел кіруючых кадраў у масава-палітычнай рабоце садзейнічае павышэнню ўзроўню ўсёй арганізацыйнай і палітычнай работы партыйных і совецкіх органаў.

Ідэйны змест праводзімых сярод насельніцтва палітычных дакладаў вызначаецца перш за ўсё саставам дакладчыкаў, узроўнем іх ведаў, іх падрыхтоўкай да выступленняў. Дастаткова высокая адукацыя, вялікі жыццёвы вопыт і вопыт практычнай работы даюць магчымасць кожнаму кіруючаму работніку самастойна падрыхтавацца і на высокім узроўні прачытаць палітычны даклад перад працоўнымі. Аднак гэта не выключае, а, наадварот, мае на мэце аказанне сістэматычнай і вялікай дапамогі дакладчыкам з боку партыйных камітэтаў. Групы дакладчыкаў пры райкомах, гаркомах, абкомах і ЦК КП(б)Б гэта — калектывы, з якімі трэба арганізаваць творчую работу, штодзённа дапамагаць у павышэнні іх тэарэтычнага ўзроўню.

У групы дакладчыкаў пры партыйных камітэтах аб'ядноўваюцца кіруючыя партыйныя, совецкія, комсамольскія і профсаюзныя работнікі. Як паказвае вопыт, гэтыя групы пры райкомах партыі аб'ядноўваюць 35—40, не больш 50 чалавек. Так, у Пліскім раёне група дакладчыкаў райкома налічвае 42 чалавекі, у Крычаўскім — 46, у горадзе Барысаве — 40 чалавек. Гутарка ідзе аб пастаянным саставе групы дакладчыкаў, які складаецца з кіруючых работнікаў. Для чытання асобных тэм могуць і павінны прыцягвацца апрача дакладчыкаў райкома і спецыялісты. У Любанскім раёне група дакладчыкаў райкома КП(б)Б налічвае 35 кіруючых работнікаў, але па тэме: «Сталінскі Статут сельскагаспадарчай арцелі» райком партыі прыцягнуў дадаткова 40 спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Па тэме: «Краіны народнай дэмакратыі на шляхах да соцыялізма» з дакладамі выступіла таксама вялікая група настаўнікаў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы